Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
____________ С. Л. Шпарло
«___» _____________ 2021 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

# АСНОВЫ МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 11*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2021

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені ОСВО 1-23 01 11-2014 па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках). Рэгістрацыйныя нумары Е 23-1-88/17, Е 23-1-89/17 вуч. ад 04.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІК**
*І. І. Бамбешка*, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А. В. Пагоцк*ая, навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства;
*Я. Л. Іванова,* намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусі», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 28.09.2020);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 09.12.2020)

Адказны за рэдакцыю: В. М. Паўлючэнка
Адказны за выпуск: І. І. Бамбешка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Змены, якія адбываюцца ў нашай краіне з канца XX ст., нарастанне інтэграцыйных працэсаў у самой культуры, закранулі ўсе ўстановы галіны, у тым ліку бібліятэкі, якія былі вымушаны пераасэнсаваць сваю дзейнасць. Гэта прывяло да пашырэння сацыяльных функцый і форм іх рэалізацыі ў новых сацыякультурных умовах. Такім чынам бібліятэкі пачалі выконваць функцыі іншых устаноў культуры з поўным захаваннем сваіх асноўных напрамкаў работы. У бібліятэках з’явіліся выставачныя залы, тэатральныя і мастацкія студыі і г. д. Значная колькасць устаноў займаецца ў той ці іншай ступені музейнай дзейнасцю (выяўленнем, зборам, інтэрпрэтацыяй непісьмовых крыніц), што вымушае пашыраць кола прафесійных кампетэнцый супрацоўнікаў бібліятэк. Такімі абставінамі абумоўлена *актуальнасць* вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства» ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфіі. Гэта дазволіць разумець каштоўнасць музейных прадметаў у кантэксце складаных культурна-гістарычных сувязей.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства» – фарміраванне музеязнаўчых навыкаў, неабходных спецыялісту для работы з прадметамі музейнага значэння і музейнымі прадметамі.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– сфарміраваць уяўленне аб спецыфіцы музея як сацыякультурнага інстытута;

– сфарміраваць уяўленні аб напрамках дзейнасці сучаснага музея;

– выпрацаваць прафесійныя навыкі і ўменні ў арганізацыі музейнай справы.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства» ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) прадугледжана фарміраванне наступных *кампетэнцый*.

*Акадэмічныя кампетэнцыі:*

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.
АК-4. Умець працаваць самастойна.
АК-5. Быць здольным генерыраваць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).
АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.
АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.
АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

*Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:*

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.
САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.
САК-6. Умець працаваць у камандзе.
САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і сусвету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

*Прафесійныя кампетэнцыі:*

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў.
ПК-22. Арганізоўваць работу малых калектываў у працэсе праектнай дзейнасці.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны:

*ведаць*:

– структуру, асноўныя паняцці і тэрміны музеязнаўства;
– тэарэтычныя і метадычныя аспекты асноўных напрамкаў музейнай дзейнасці;
арганізацыйныя прынцыпы існавання сучаснага музея;

*умець*:

– выкарыстоўваць асноўныя паняцці, тэрміны, навыкі і фактычны матэрыял па музеязнаўстве ў тэарэтычнай, метадычнай і практычнай музейнай дзейнасці;
– аналізаваць крыніцы па сучасным стане музейнай справы;
– выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці юрыдычна-прававую базу дзейнасці музеяў Рэспублікі Беларусь;

*валодаць*:

– асноўнымі метадамі музеязнаўчых даследаванняў;
– асноўнымі прыёмамі аналізу музейнай справы ў сучасным свеце і Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– метадамі і прыёмамі збору і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны;

– навыкамі арганізацыі дзейнасці музеяў у кантэксце сацыяльна-культурай дзейнасці.

Вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі вучэбных дысцыплін агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыклаў: «Гісторыя», «Дакументалогія», «Культуралогія» і інш.

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства» прапануецца выкарыстоўваць тлумачальна-ілюстрацыйныя тэхналогіі для эфектыўнасці перадачы абагульненай і сістэматызаванай інфармацыі, тэхналогіі для актывізацыі разумовай дзейнасці студэнтаў (праблемнае навучанне), для эфектыўнасці кіравання і арганізацыі вучэбнага працэсу (індывідуалізацыя навучання), інтэрактыўныя метады практыка-арыентаванага навучання (калектыўныя дыскусіі і інш.). Змест вучэбнай праграмы патрабуе выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на лекцыйных, семінарскіх і практычных занятках. Лекцыі раскрываюць асноўныя пытанні кожнай тэмы вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства». Семінарскія заняткі праводзяцца па тэмах вучэбнай дысцыпліны, якія патрабуюць набыцця практычных навыкаў работы з дакументамі, замацавання тэарэтычных ведаў, атрыманых на лекцыях і ў выніку самастойнай працы над навучальным матэрыялам. Практычныя заняткі прадугледжваюць азнаямленне студэнтаў са спецыфічнымі формамі і відамі музейнай дзейнасці, дакументацыяй, а таксама наведванне вядучых музеяў краіны (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і інш.).

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства» прадугледжана 52 гадзіны, з іх 34 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 14 гадзін, семінарскія заняткі – 2 гадзіны, практычныя заняткі – 18 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Актуальнасць, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства», яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць». Міждысцыплінарныя сувязі музеязнаўства, бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і дакументазнаўства. Прадмет вучэбнай дысцыпліны. Структура вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў, форма кантролю. Вучэбна-метадычнае і інфармацыйнае забеспячэнне вучэбнай дысцыпліны.

### *Тэма 1. Гісторыя станаўлення музеязнаўства як навуковай дысцыпліны*

Асноўныя вехі станаўлення музеязнаўства. Першыя даследаванні па музеязнаўстве: С. фон Кічэберг (1565), І. Д. Маёр (1674), К. Ф. Нікеліус (1727), К. Ліней (1753), Г. Клем (1837) і іншыя даследчыкі. Тэарэтычныя пытанні музеязнаўства ў першых перыядычных выданнях: «Часопіс па музейнай і антыкварнай справе» (Дрэздэн, 1878), «Музейны часопіс» (Лондан, 1901) і інш. Першыя праекты стварэння музеяў. Вучэнне М. Ф. Фёдарава і месца ў ім музея. Распрацоўка пытанняў музеязнаўства ў ХХ–ХХІ стст. Утварэнне і дзейнасць ІКАФОМ.

Музеязнаўства ў Беларусі. Працы А. А. Гужалоўскага, А. М. Калбаскі і іншых вучоных. Дзейнасць БелДІПК у галіне музеязнаўства. Выданне «Музейных сшыткаў».

### *Тэма 2. Музеязнаўства як навуковая дысцыпліна*

Вызначэнне музеязнаўства як навуковай дысцыпліны. Аб’ект музеязнаўства. Разуменне аб’екта музеязнаўства як гістарычнай формы існавання грамадскай патрэбы ў адборы, захаванні і выкарыстанні музейнасці. Прадмет музеязнаўства: фарміраванне ўяўленняў аб прадмеце музеязнаўства, праблема трактоўкі прадмета музеязнаўства, канцэптуальныя падыходы да вызначэння прадмета музеязнаўства.

Праблемнае поле музеязнаўства.

Уласная тэрміналогія як прымета самастойнай навуковай дысцыпліны. Тэрміналагічныя пытанні навукі. Міжнародны

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

характар і ступень распрацаванасці мовы музеязнаўчай навукі. Фарміраванне паняційнага апарату музеязнаўства. Выданне 20-моўнага музеялагічнага гласарыя (1986). Ключавыя паняцці музеялогіі (2012). Падрыхтоўка і выданне музейнай энцыклапедыі ў СССР і Расійскай Федэрацыі. Расійская музейная энцыклапедыя (2001). Выданне слоўніка актуальных музейных тэрмінаў (2009). Фарміраванне беларускамоўнай музейнай тэрміналогіі. Перакладныя беларуска-англійскія і музеялагічныя беларуска-рускія слоўнікі.

Метад як прымета навукі. Асаблівасці і характарыстыкі метаду музеязнаўства. Агульнанавуковыя і спецыяльныя навуковыя метады профільных і сумежных навук у сістэме метаду музеязнаўства.

Структурна-функцыянальны падыход да музеязнаўства. Узаемасувязь теарэтычнага і прыкладнога музеязнаўства. Складовыя элементы музеязнаўства: генетычны (гісторыя музейнай справы), структурны (тэорыя дакументавання, тэорыя тэзаўравання, тэорыя музейнай камунікацыі), практычны (прыкладное музеязнаўства).

Міждысцыплінарнасць музеялогіі як спецыфічная рыса гэтай сферы ведаў. Музеязнаўства і іншыя сферы навуковых ведаў: агульнагуманітарныя, профільныя. Узаемаадносіны і ўнутраныя сувязі.

*Тэма 3. Музейны прадмет у структуры музейнай справы*

Змест паняцця «музейны прадмет». Праблема суадносін: прадмет музейнага значэння – музейны прадмет – музейны экспанат. Асноўныя ўласцівасці музейнага прадмета. Інфармацыйны патэнцыял і інфармацыйнае поле. Паняцце «музеальнасць».

Аналіз каштоўнасці музейнага прадмета. Паняцце тыповых і ўнікальных музейных прадметаў. Музейная каштоўнасць музейнага прадмета. Функцыі музейнага прадмета.

Вызначэнне музейнага прадмета з пазіцыі камунікацыйнага падыходу ў музеязнаўстве. Месца музейнага прадмета ў мадэлях акта музейнай камунікацыі Д. Камерона і Э. Хупер-Грынхіл. Музейныя прадметы як знакі музейнай мовы. Семантычная характарыстыка музейнага прадмета.

Пашырэнне зместу музейнага прадмета. Нематэрыяльная спадчына як аб’ект музейнага калекцыянавання. Магчымасці і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

межы выкарыстання нерухомых помнікаў гісторыі і культуры ў музейных мэтах.

*Тэма 4. Музей як сацыяльны інстытут*

Этымалогія паняцця «музей». Тэорыі паходжання музеяў: біялагічная, суб'ектыўна-эстэтычная, філалагічная, сацыяльная і інш. Этапы фарміравання музея як сацыяльнага інстытута.

Вызначэнне тэрміна «музей». Характарыстыка музея як навукова-даследчай і навукова-асветніцкай установы. Сацыяльныя функцыі музея. Формы рэалізацыі музеямі сацыяльных функцый.

Сучасныя класіфікацыі музеяў па сутнасным прыметам. Крытэрыі для вылучэння груп музеяў. Узнікненне новых фарміраванняў музейнага характару: музей-запаведнік, цэнтр культурнай спадчыны, нацыянальны парк і інш.

Паняцце «музейная сетка». Дынаміка і агульныя тэндэнцыі развіцця музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Структура музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь.

*Тэма 5. Асноўныя напрамкі музейнай дзейнасці*

Паняцце навуковага дакументавання ў сучасным музеязнаўстве. Навуковае дакументаванне з'яў, працэсаў прыроды і грамадства як спецыфічны тып музеялагічнага даследавання.

Мэта і сэнс дакументавання. Прынцыпы і крытэрыі дакументавання. Кагнітыўна-каштоўнасны характар музейнага дакументавання. Паняцці «рэч», «прадмет музейнага значэння», «музейны прадмет». Навуковае камплектаванне як практычнае ўвасабленне тэорыі дакументавання. Прынцыпы адбору прадметаў музейнага значэння ў музейны збор. Спецыфіка камплектавання фондаў музеяў розных профіляў і тыпаў. Дакументацыйнае забеспячэнне камплектавання фондаў.

Паняцце тэзаўрацыі (тэзаўравання) і яго інтэрпрэтацыя ў сучасным музеязнаўстве. Тэзаўрацыя як другая ступень вывучэння музейнасці, яе пазнання, уліку і аховы.

Працэс стварэння фонду музейных прадметаў як адзін з элементаў тэзаўравання. Музейны фонд як «новая культурная рэальнасць». Паняцці «музейная калекцыя», «музейны збор».

Прынцыпы вывучэння музейных збораў як асаблівай мадэлі рэальнага асяроддзя і дакументальнай сістэмы. Класіфікацыя, сістэматызацыя і інтэрпрэтацыя музейных прадметаў у кан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэксце тэзаўравання. Значэнне навуковай арганізацыі фондаў. Паняцце «другасная дакументацыя».

Юрыдычны і навуковы аспекты ўліку музейных фондаў. Асноўныя этапы ўліку фондаў. Прызначэнне і структура навукова-даведачнага апарата. Сучасныя тэхналогіі ўліку музейных прадметаў. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі і тэзаўраванне. Музейная каталагізацыя і інфармацыйныя сістэмы.

Ахова музейных прадметаў і інфармацыі, якая ў іх утрымліваецца, як адзін з элементаў тэзаўрацыі.

Нарматыўна-прававое забеспячэнне камплектавання, уліку, вывучэння і захавання музейных фондаў.

Музейная форма камунікацыі. Роднасць з іншымі формамі культурнай камунікацыі. Асноўныя тыпы культурнай і музейнай камунікацыі. Спецыфічнасць музейнай камунікацыі. Тэорыя музейнай камунікацыі як аснова экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці музея на сучасным этапе.

Экспазіцыя як адна з форм навуковай работы музея і спецыфічная форма публікацыі і інтэрпрэтацыі музейных збораў. Паняцце аб выстаўцы як форме экспазіцыйнай работы музея. Тыпы і віды выставак.

Адукацыйныя магчымасці музея. Формы работы з наведвальнікамі, іх класіфікацыя. Пазамузейныя формы адукацыйна-выхаваўчай работы. Формы і метады работы музея з рознаўзроставай аўдыторыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назвы раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | практычныя заняткі | колькасць гадзін КРС | |
| Уводзіны | 0,5 | | | | |
| *Тэма 1*. Гісторыя станаўлення музеязнаўства як навуковай дысцыпліны | 1 | | | 1 | канспектаванне прац тэарэтыкаў музеязнаўства. Абмеркаванне ў групах |
| *Тэма 2*. Музеязнаўства як навуковая дысцыпліна | 2 | | 2 | 1 | распрацоўка ўласнага праекта тэрміналагічнага музеязнаўчага слоўніка |
| *Тэма 3*. Музейны прадмет у структуры музейнай справы | 2,5 | | 4 | 1 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| *Тэма 4*. Музей як сацыяльны інстытут | 2,5 | 2 | 4 | 2 | наведванне музеяў, падрыхтоўка і напісанне эсэ па выніках знаёмства з музеямі |
| *Тэма 5*. Асноўныя напрамкі музейнай дзейнасці | 3,5 | | 4 | 1 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Разам …** | **12** | **2** | **14** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Ананьев, В. Г.* История зарубежной музеологии: Идеи, люди, институты / В. Г. Ананьев. – М. : Памятники исторической мысли, 2018. – 392 с.

*2. Калбаска, А. М.* Музейны дыярыуш, ці Уваходзіны ў новую музеялогію / А. М. Калбаска. – Мінск : БелІПК, 1999. – 148 с.

*3.* Ключевые понятия музеологии : [перевод / составители: André Desvallées и François Mairesse]. – М. : ИКОМ России, 2012. – 101 с.

*4.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : уступ. у сілу з 3 лют. 2017 г. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2016. – 271 с.

*5.* Музееведение. Музеи исторического профиля : учеб. пособие для вузов па специальности «История» / под ред. К. Г. Левыкина, В. Хербста. – М. : Высш. шк., 1988. – 431 с.

*6.* Музейное дело в России / под ред. М. Е. Каулен (отв. ред.), И. М. Коссовой, А. А. Сундиевой. – 2-е изд. – М. : ВК, 2005. – 614 с.

*7.* Основы музееведения : учеб. пособие / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Editorial URSS, 2005. – 504 с.

*8.* Словарь актуальных музейных тэрминов // Музей. – 2009. – № 5. – С. 47–68.

*9. Сотникова, С. И.* Музеология : пособие для вузов / С. И. Сотникова. – М. : Дрофа, 2004. – 192 с.

*10. Столяров, Б. А.* Музейная педагогика. История, теория, практика : учеб. пособие / Б. А. Столяров. – М. : Высш. шк., 2004. – 216 с.

*11. Шляхтина, Л. М.* Основы музейного дела: теория и практика : учеб. пособие для педагогических и гуманитарных высших учебных заведений / Л. М. Шляхтина. – М. : Высш. шк., 2005. – 182 с.

*12. Юренева, Т. Ю.* Музееведение: учеб. для высш. школы / Т. Ю. Юренева. – М. : Академический проект, 2003. – 558 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Камерон, Д.* Музей: храм или форум / Д. Камерон // Музейное дело : сб. науч. тр. / Музей Революции. – М., 1992. – Вып. 21 : Музей – культура – общество. – С. 259–275.

2. *Лорд, Б.* Менеджмент в музейном деле : учеб. пособие / Б. Лорд, Г. Д. Лорд; пер. с англ. Э. Н. Гусинского, Ю. И. Турчаниновой ; под ред. А. Б. Голубовского. – М. : Логос, 2002. – 254 с.

3. Музеи Литвы и Беларуси: пути и перспективы развития в XXI веке : материалы конф., Минск – Вильнюс – Тракай, 2006–2007 / сост.: Е. Матевосян, В. Повилюнас, А. Сташкевич. – Минск, 2007. – 111 с.

4. Музеи. Маркетинг. Менеджмент : сб. ст. : практ. пособие / редкол.: С. Кози [и др.] (брит. сторона), В. Дукельский [и др.] (рос. сторона). – М. : Прогресс-Традиция, 2001. – 222 с.

5. Музей будущего: информационный менеджмент / АНОК «Музей будущего», Рос. ин-т культурологии [и др.] ; сост. А. В. Лебедев. – М. : Прогресс-Традиция, 2001. – 320 с.

6. Музей и демократия : сб. науч. тр. / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. акад. наук, Рос. ин-т культурологии; редкол.: Н. А. Никишин (отв. ред.) [и др.]. – М. : РИК, 1997. – 150 с. (Сер. электронных изданий. MUSEUM-PRO. Вып. 1.0.)

7. Музей і наведвальнік : матэрыялы навук.-практ. семінара (24–25 лістап. 1998 г.) / рэдсавет: З. Шыбека (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1999. – 45 с.

8. Музей и новые технологии : сб. науч. тр. / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. акад. наук, Рос. ин-т культурологии; сост. и науч. ред. Н. А. Никишин. – М., 1999. – 216 с.

9. Музейная педагогіка. Праблемы арганізацыі музейнай работы з дзецьмі : навук.-метад. зб. / уклад В. У. Міронччык. – Мінск : БелІПК, 1997. – 71 с.

10. Музейная экспозиция. Теория и практика. Искусство экспозиции. Новые сценарии и концепции : сб. науч. тр. / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. акад. наук, Рос. ин-т культурологии; редкол.: М. Т. Майстровская (отв. ред.) [и др.]. – М. : РИК, 1997. – 222 с.

11. *Портер, Д.* Роль музея как средства коммуникации / Д. Портер // Museum. – 1983. – № 138. – С. 10–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Стэнтон, Д.* Коммуникация и средства коммуникации: некоторые проблемы экспонирования / Д. Стэнтон // Museum. – 1983. – № 139. – С. 28–33.

*13.* Терминологические проблемы музееведения : сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР ; редкол.: Т. Г. Шумная (отв. ред.) [и др.]. – М. : [б. и.], 1986. – 135 с.

*14. Шола, Т.* Предмет и особенности музеологии / Т. Шола // Museum. – 1987. – № 153. – С. 49–53.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендуемыя метады выкладання

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў па асновах музейнай справы.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.).

Для ўпраўлення вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

## Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі

Для выніковай дыягностыкі ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў, атрыманых у працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Асновы музеязнаўства», праводзіцца залік. Атэстацыя студэнтаў ажыццяўляецца з улікам іх акадэмічнай актыўнасці на лекцыйных, семінарскіх і практычных занятках.

Асноўнымі відамі кантролю, якія забяспечваюць высокую ступень дыягностыкі ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне, з’яўляюцца: экспрэс-апытанне ў вуснай або пісьмовай форме, сумоўе па пройдзеным лекцыйным матэрыяле, рэкамендаванай для вывучэння літаратуры; праверка канспектаў лекцый і работ, выкананых у ходзе лабараторных заняткаў. Выніковая атэстацыя – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Арганізацыя і выкананне самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з вучэбным планам (рабочыя варыянты). Прадугледжваюцца такія формы, як падрыхтоўка студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, прэзентацый, складанне бібліяграфічных спісаў, распрацоўка ўласнага праекта тэрміналагічнага слоўніка па музеязнаўстве, канспектаванне прац тэарэтыкаў музеязнаўства, наведванне музеяў, падрыхтоўка і напісанне эсэ па выніках знаёмства з музеямі і інш.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас семінарскіх і лекцыйных заняткаў, а таксама ў час правядзення заліку.

Выкладчык-прадметнік знаёміць студэнтаў са спецыфікай той ці іншай самастойнай работы і спосабамі яе кантролю падчас уводнай лекцыі па вучэбнай дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**АСНОВЫ МУЗЕЯЗНАЎСТВА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 11*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Рэдактар В. М. Паўлючэнка
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2021. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,55. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ